*Юры Грыбоўскі (Менск),*
***малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі***

# Перыядызацыя ўдзелу беларусаў у польскіх рэгулярных вайсковых фармаваннях (1921 – 1947 г.)

Усе пасляваенныя дзесяцігоддзі беларуская савецкая гістарыяграфія ўдзелу беларускага народу ў Другой сусветнай вайне была пазбаўлена аб’ектыўнасці. Гэта датычыла не толькі пытанняў супрацоўніцтва беларусаў з акупацыйным рэжымам, але і ўдзелу нашых землякоў у баявых дзеяннях на франтах у складзе польскіх рэгулярных вайсковых фармаванняў пад брытанскай, французскай ды савецкай камандамі. Перш за ўсё, мы маем на ўвазе беларусаў у шэрагах узброеных сілаў міжваеннай польскай дзяржавы, а менавіта Войску Польскім у перыяд верасьнёўскай кампаніі 1939 г., г.зв. Арміі Андэрса (1941 – 1945) і Арміі Берлінга (1943 – 1945). Варта адразу пазначыць, што два апошнія паняцці, уведзеныя ў навуковы зварот дзякуючы савецкай гістарыяграфіі, не зусім адпавядаюць гістарычнай аб’ектыўнасці, паколькі ў ваенны час не існавала гэткіх назваў. Паняцці “Армія Андэрса” і “Армія Берлінга” паходзяць непасрэдным чынам ад прозвішчаў польскіх генералаў Уладзіслава Андэрса і Зыгмунда Берлінга, якія адыгралі істотную ды кіроўную ролю ў дзейнасці вышэйзгаданых фармаванняў. Надалей у дачыненні да гэтых умоўных назваў фармаванняў мэтазгодна ў дачыненні да іх дапасоўваць паняткі з польскай вайсковай гістарыяграфіі, адпаведна – Польскія ўзброеныя сілы на захадзе (ПУСЗ) і Польскія ўзброеныя сілы на баку СССР.

З моманту заключэння Рыжскай дамовы 1921 г. і да пачатку Другой сусветнай вайны – праз шэрагі ўзброеных сілаў ІІ Рэчы Паспалітай на падставе польскага грамадзянства штогадова праходзіла ня менш чым 10 тыс. беларусаў. Гэты перыяд характарызуецца паступовай мілітарызацыяй польскімі ўладамі тэрыторыі “паўночна-ўсходніх крэсаў”, што было абумоўлена знешнепалітычнымі абставінамі, у прыватнасці межаваннем з Савецкім Саюзам, з якім на працягу ўсяго міжваеннага часу захоўваліся даволі напружаныя адносіны. Асаблівая небяспека пачатку новай вайны з СССР, які дэманстраваў палітыку “экспарту рэвалюцыі” і падтрымліваў антыпольскія рухі ў Заходняй Беларусі, назіралася ў першай палове 20-х г. Гэткае становішча не магло не адлюстравацца на вайсковым будаўніцтве Войска Польскага на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а таксама на стане яе жыхароў у шэрагах гэтай дзяржаўнай установы. Так, у 1924 г. дзеля забеспячэння бяспекі ўсходняй мяжы быў створаны Корпус аховы памежжа (КАП), чатыры брыгады якога (“Гародня”, “Вільня”, “Наваградак”, “Палессе”) кватаравалі на тэрыто-

рыі Беларусі[1] . Першапачаткова пераважная колькасць асабовага складу вышэйзгаданых адзінак складалася з тутэйшага насельніцтва, якое выдатна ведала мясцовасць. Акрамя памежнай варты ў міжваенны перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі дыслакаваліся два корпусы – 3-ці (Гародня) і 9-ы (Бярэсце), сем пяхотных дывізіяў (19 палкоў), чатыры брыгады кавалерыі (10 палкоў), полк вайсковага лятунства (у Лідзе), палкі артылерыі. Да гэтага пераліку належыць дадаць дзве рэзервовыя пяхотныя дывізіі і брыгаду кавалерыі[2]. Звыш 30 тыс. жыхароў Заходняй Беларусі былі сябрамі ваенізаваных ды парамілітарных арганізацыяў і асяродкаў, накшталт "Стральца", Федэрацыі ўзброеных абаронцаў радзімы, ТУР і інш. Пераважная большасць беларусаў адбывала чынную службу ў Войску Польскім у шыхтах пяхоты, значна меней у кавалерыі і артылерыі, адзінкавыя выпадкі – ў лятунстве, жандармерыі альбо чыгуначных войсках. Перадусім, гэта было абумоўлена адсутнасцю адмысловай адукацыі. Паколькі беларусы былі трэцімі па колькасці сярод польскіх вайскоўцаў пасля ўласна палякаў і ўкраінцаў, то адпаведныя паказчыкі меліся па дэзэрцыі. Найвышэйшая колькасць выпадкаў ухілення ад вайсковага чыну сярод нашых землякоў была адзначана ў 1923 г., калі дасягнула 1533 асобаў[3] . Большасць беларусаў кіраваліся найперш пабытовымі матывамі. Разам з гэтым прысутнічала і палітычная матывацыя. Так, вядома, што ў 1921 – 1923 г. надзвычай запаволена адбываўся працэс вайсковых набораў на Гарадзеншчыне, паколькі пад уплывам заклікаў беларускіх нацыянальных сілаў у Літве, дзе акурат дзейнічалі беларускія вайсковыя аддзелы, назіраліся пераходы на бок апошніх польскіх вайскоўцаў беларускага паходжання цэлымі падраздзеламі[4]. Таксама ўжо ў сярэдзіне 30-х г. каля 11% дэзэртыраў-беларусаў абгрунтавалі свае ўчынкі ўплывам КПЗБ. Як вядома, гэта палітычная сіла тады разгарнула шырокую працу сярод "паборавых".

З канца 20-х да пачатку 30-х г. "тубыльцаў" з "крэсаў паўночна-ўсходніх" пасылалі адбываць вайсковую чыннасць як мага далей ад родных мясцінаў. Акрамя таго, было прынятае рашэнне абмежаваць удзел нацыянальных меншасцяў у войску да 30%. Усходнія ваяводствы лічыліся найбольш ненадзейнымі, бо тут мелася надзвычай спрыяльная глеба для дзейнасці разнастайных антыпольскіх і прасавецкіх рухаў. У 1936 г. быў афіцыйна забаронены набор ў падафіцэрскія і афіцэрскія вучэльні прэтэндэнтаў-непалякаў[5] . Аднак нягледзячы на практычныя крокі польскіх чыноўнікаў нават да канца 30-х г. беларусы складалі большасць у 3-м ды 9-м карпусах, абшар дзеяння якіх прыпадаў на Заходнюю Беларусь.

Да сярэдзіны 30-х г. у Войску Польскім захоўвалася поўная рэлігійная талерантнасць. Была вызначана чарга прыняцця прысягі ў залежнасці ад веравызнан-

[1] Dominiczek H. Ochrona granicy wschodniej w latach 1919-1939. Warszawa, 1985. S. 113.
[2] Tuchowski J. Mord w Katyniu. Warszawa, 1991. S. 550-552.
[3] Gomólka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej. Gdańsk, 1992. S. 137-150.
[4] НА РБ. Ф. 325, воп.1, спр. 57, л. 58-59.
[5] Gomólka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej. S. 140-141.

ня – рыма-каталікі, эвангелісты, праваслаўныя. Варта адзначыць, што для апошніх з дазволу Міністэрства вайсковых справаў праводзілася праца па друкаванні малітоўніка на беларускай мове. З 1938 г. Польская аўтакефальная праваслаўная царква спрыяла да працэсу апалячвання сярод вайскоўцаў, аб чым сведчаць наданне япіскапскага сану вайсковым капеланам ў годнасці палкоўнікаў – Цімафею і Мацвею[6].

Новым этапам прысутнасці беларусаў у шэрагах узброеных сілаў Польшчы сталася вераснёўская кампанія 1939 г. У шыхтах Войска Польскага брала ўдзел каля 100 тыс. нашых землякоў. З моманту прыняцця ў сакавіку 1939 г. аперацыйнага плану "Захад" на тэрыторыі міжваеннай польскай дзяржавы, у тым ліку і ў Заходняй Беларусі, адбывалася павольная мабілізацыя. 23 жніўня 1939 г. была абвешчана частковая мабілізацыя, а праз тыдзень – ўсеагульная. Дзякуючы гэтым мерапрыемствам, да заходняй мяжы ІІ Рэчы Паспалітай былі перакінутыя асноўныя баяздольныя злучэнні і часці. На "крэсах усходніх" за гэтыя дні былі мабілізаваны чатыры пяхотныя дывізіі – 33, 35, 36 і 38-я. Большасць цалкам укамплектаваных за кошт мясцовага насельніцтва палкоў КАП былі далучаныя да армій "Лодзь" і "Кракаў"[7]. Нават частка цяжкіх гарматаў Пінскай рачной флатыліі была адкамандзіравана пад Гдыню, дзеля ўзмацнення тамтэйшай залогі, дзе чакаўся нямецкі наступ.

Разам з тым, пэўная колькасць рэзервістаў з трох паўночна-ўсходніх ваяводстваў так і не была перакінута на захад па прычыне імклівага разгортавання баявых дзеянняў на нямецка-польскім фронце. Яскравым прыкладам ёсць рэзервовая брыгада кавалерыі "Ваўкавыск", якая была цалкам сфармавана толькі ў сярэдзіне верасня 1939 г., калі ўжо стала відавочнай пагроза з усходу, а менавіта пераход польскай мяжы войскамі Чырвонай арміі.

Урэшце рэшт пасля паразы Польшчы большасць польскіх вайскоўцаў беларускага паходжання апынулася ў нямецкім і савецкім палоне. Да ліку першых адносяцца вайскоўцы-беларусы, якія на момант гітлераўскага нападу адбывалі чынную службу ў Войску Польскім (да 15 тыс. чалавек), а таксама мабілізаваныя паводле загадаў аб частковай мабілізацыі ад 23 жніўня і ўсеагульнае ад 31 жніўня 1939 г. Згодна з дадзенымі беларускіх эмігрантаў у Нямеччыне ў лагерах ваеннапалонных Ламбіновічы, Рагозіца, Жадзін, Дабеднеў (усходняя Нямеччына) і інш. увосень 1939 г. налічвалася да 70 тыс. чалавек[8] . У сваю чаргу іншая частка нашых землякоў патрапіла ў савецкі палон. Галоўным чынам, гэта польскія вайскоўцы з ліку жаўнераў КАП, якія першымі сустрэлі савецкія войскі на памежжы (звыш 12 тыс. чалавек), рэзервісты, закліканыя ў рэзервовыя аддзелы альбо часткі Нацыянальнай абароны. Агулам 17 верасня войскам Беларускага фронту супроцьстаяла да 45 тыс. польскіх вайскоўцаў, якія былі толькі часткова ўзброеныя. Гэта рэшткі 1-й пяхотнай дывізіі легіёнаў (Вільня), 19-й (Ліда) і 29-й (Баранавічы) пяхотных дывізіяў,

[6] Мірановіч Я. Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток, 1999. С. 105.
[7] Grzalek Cz. Kresy w czerwieniu. Warszawa, 1998. S. 1998.
[8] Раніца. Беларуская тыднёвая газэта ў Нямеччыне. 1939 №1.

полк КАП "Баранавічы", паўбрыгада Нацыянальнай абароны "Дзісна", шэраг рэзервовых злучэнняў і г.д. План "Захад" не быў разлічаны на вайну на два франты, таму вайсковыя часткі каля ўсходніх межаў краіны былі не гатовыя да баявых дзеянняў. Сярод нядаўна мабілізаваных асобаў назіраліся выпадкі дэзерцірства. Гэтая з'ява асабліва была пашырана ў шыхтах 20-й пяхотнай дывізіі (Слонім)[9].

Невядома колькі вайскоўцаў-беларусаў апынулася ў савецкім палоне, бо нават канчаткова не высвятлены агульны лік польскіх ваеннапалонных на савецкім баку – называюцца лічбы ад 140 да 452 тыс. чалавек. На падставе ўскосных падлікаў можна сцвярджаць, што колькасць нашых землякоў сярод палонных складала не менш за 30 тыс. асобаў. Акрамя таго на працягу лістапада 1939 г. нямецкі бок перадаў сваім савецкім хаўруснікам 10 409 польскіх вайскоўцаў, якія стала пражывалі на тэрыторыі Палескага, Віленскага і Наваградскага ваяводстваў даваеннай польскай дзяржавы[10]. Яшчэ каля 5000 беларусаў знаходзілася ў ліку польскіх вайсковых адзінак інтэрнаваных на тэрыторыі суседняй Літоўскай Рэспублікі.

Наступны перыяд у жыцці польскіх вайскоўцаў беларускага паходжання, гэта гады нямецкага і савецкага палону (лістапад 1939 – чэрвень 1941 г.). Уключэнне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад БССР і УССР падрыхтавала юрыдычную падставу для вызвалення з лагераў польскіх ваеннапалонных ураджэнцаў вышэйзгаданых тэрыторыяў. Дарэчы, яшчэ 3 кастрычніка 1939 г. прагучала распараджэнне Л.Берыя і Л.Мехліса згодна з якім беларусы і ўкраінцы сярод польскіх ваеннапалонных мусілі аўтаматычна вызваляцца з-пад варты. На падставе гэтага дакументу, а таксама шэрагу іншых распараджэнняў, у хуткім часе было вызвалена 42 400 чалавек, з якіх каля палове складалі этнічныя беларусы. Нягледзячы на гэта, у лагерах Наркамата чорнай металургіі на Украіне і лагерах у Комі АССР да чэрвеня 1941 г. знаходзілася каля 10 000 польскіх ваенапалонных беларускага паходжання[11].

Па іншаму склаўся лёс беларусаў у нямецкім палоне. Дзякуючы руплівай дзейнасці беларускіх нацыянальных сілаў (Беларускага прадстаўніцтва і Беларускага камітэту самапомачы) статус палонных-беларусаў паступова змяняўся на стан вольных работнікаў поплеч з ваеннапалоннымі заходнееўрапейскіх краінаў. Варта зазначыць, што акурат з верасня 1939 г. назіраўся імклівы рост беларускай эміграцыі ў Нямеччыне, якая гуртавалася галоўным чынам вакол Беларускага камітэту самапомачы, аддзелы якога дзейнічалі на амаль на ўсім абшары рэйху[12]. Гэткім чынам яны назаўсёды скінулі польскія мундыры, але вайна для іх далёка яшчэ не

[9] Wierzbicki M. Białorusini w Wojsku Polskim w czasie kompanii wrześniowej 1939 r. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1996. Nr 2(6). S. 70-75; Cygan W. Kresy w ogniu. Wojna polsko-sowiecka 1939. Warszawa, 1990. S. 31.

[10] Сталин, Берия и судьба армии Андерса // Новая и новейшая история. 1993. № 2. С. 57.

[11] Катынь. Пленники необъявленной войны. Москва, 1993. С. 121.

[12] Вініцкі К. Матар'ялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне ў 1939-1951 гадох. Менск, 1994. С. 11-15.

скончылася. Пазней масы гэтых вайскоўцаў былі выкарыстаныя нямецкім бокам падчас фармавання ў Нямеччыне беларускіх нацыянальных узброеных адзінак.

Асобнаю старонкаю чыннага ўдзелу беларусаў у польскіх рэгулярных вайсковых фармаваннях з'яўляецца масавая прысутнасць эмігрантаў з Заходняй Беларусі ў шэрагах польскіх часцей у Францыі на момант нападу Нямеччыны ў траўні-чэрвені 1940 г. Паколькі на той час польскі эміграцкі ўрад знаходзіўся ў Парыжы, то ў польскія вайсковыя адзінкі пад французскай камандаю пачалі заклікацца ўсе без вынятку былыя падданыя II Рэчы Паспалітай, у тым ліку і беларускія эмігранты. Гэтая мабілізацыя выклікала хвалю абурэння дзеячаў "Беларускага Хаўрусу работнікаў у Францыі", якія дамагаліся фармавання асобнага беларускага батальёну ў складзе французскага Іншаземнага легіёну. Нягледзячы на тое, што 1 200 беларусаў згадзіліся ўступіць у яго, польскія вайсковыя ўлады дамагліся ад французаў адмовіцца ад думкі стварэння непольскіх вайсковых частак. У рэшце рэшт каля 6000 беларускіх эмігрантаў у Францыі былі ўключаныя ў склад як уласна французскіх, гэтак і польскіх вайсковых фармаванняў. Яны склалі асобную брыгаду стральцоў падхаландскіх і 10-ю бранетанкавую брыгаду, якія бралі ўдзел у баях у Нарвегіі і Францыі ў 1940 г.[13]

Тым часам, не абмінула беларускіх эмігрантаў у Францыі і грамадзянская вайна ў Іспаніі (1936 – 1939). Але паколькі сярод вялікай колькасці інтэрнацыянальных брыгадаў на баку Рэспубліканскай арміі ўласна беларускіх аддзелаў не існавала, то нашым землякам даводзілася змагацца ў складзе іншаземных адзінак. Так, у шэрагах Польскай брыгады імя Я.Дамброўскага і іншых больш дробных польскіх фармаванняў агульнай колькасцю звыш 8000 чалавек за гады вайны змагалася каля 2000 беларусаў, з якіх каля 300 загінула. Амаль усе яны стала жылі ў Францыі, а з пачаткам вайны ў Іспаніі перайшлі франка-іспанскую мяжу і далучыліся да войскаў рэспубліканцаў. Варта адзначыць, што лёс гэтых людзей склаўся па-рознаму. Каля ста беларусаў апынулася ў лагерах інтэрнаваных на тэрыторыі "вішскай" Францыі на поўдні гэтай краіны, астатнія ўключыліся ў шэрагі французскага руху супраціву і аддзелаў макі альбо праз Блізкі Усход дайшлі да СССР, дзе ўліліся ў склад фармаваных польскіх злучэнняў генерала Зыгмунда Берлінга[14] .

Наступны этап удзелу беларусаў у польскіх вайсковых фармаваннях распачынаецца ўлетку 1941 г. і звязаны ён з польскімі ваеннапалоннымі беларускага паходжання на тэрыторыі Савецкага Саюза. Становішча зняволеных польскіх вайскоўцаў у СССР карэнным чынам змянілася пасля пачатку нямецка-савецкай вайны ў чэрвені 1941 г. Вонкавая пагроза з боку колішняга хаўрусніка прымусіла ўрад СССР пайсці на часовае замірэнне з польскім эміграцкім урадам генерала Уладзіслава Сікорскага. Паводле дэкрэту ВС СССР ад 12 жніўня 1941 г. польскія ваенапалонныя атрымалі амністыю, а з іх ліку распачалося фармаванне Польскай арміі на тэрыторыі СССР на чале з генералам У.Андэрсам.

---

[13] Раніца. Беларуская тыднёвая газэта ў Нямеччыне. 1939 № 9.

[14] Polacy w wojnie Hiszpańskiej. Pod red. Michała Bronia. Warszawa, 1963. S. 85-96.

У выніку вялікага наплыву дабраахвотнікаў савецкі бок, каб злагодзіць польскіх хаўруснікаў дазволіў у снежні 1941 г. заклік у Польскую армію жыхароў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны польскага паходжання. Гэта дало штуршок да ўступлення ў ствараемыя вайсковыя адзінкі тысячам асобаў, гвалтоўна дэпартаваных з заходніх абласцей БССР на працягу 1939 – 1941 г. Польскі бок, кіруючыся прынцыпам прызнання сваёй усходняй мяжы на 1 верасня 1939 г., не ладзіў сур'ёзных перашкодаў дзеля заклiку ў армію Андэрса грамадзянаў СССР, якія напярэдадні Другой сусветнай вайны жылі ва ўсходніх ваяводствах II Рэчы Паспалітай[15].

Як вядома, да канца 1942 г. генерал Андэрс здолеў вывясці звыш 70 тыс. вайскоўцаў і каля 30 тыс. цывільных асабаў у Іран, адкуль распачаўся шлях нашых землякоў ужо ў шэрагах ПУСЗ, падпарадкаваных Брытанскаму камандаванню. Яны праходзілі перападрыхтоўку і шкаленне на брытанскі капыл на вучэбных базах на Сярэднім і Блізкім Усходзе, былі аховай брытанскіх нафтавых сховішчаў у Іраку. Менавіта на Блізкім і Сярэднім Усходзе эвакуаваныя з Андэрсам вайскоўцы і цывільныя асобы, здольныя датрымання зброі, былі перафармаваныя, у выніку чаго частку накіравалі ў Англію, дзе дыслакаваліся польскія авіяцыйныя і марскія адзінкі ў складзе брытанскага войска і 1 Польскі корпус. Аднак большасць нядаўніх вязняў савецкіх лагераў патрапіла ў склад 2 Польскага корпуса, які быў пераведзены ў Егіпет. Пасля стварэння ПУСЗ пад брытанскай камандай на праблему нацыянальных меншасцяў у гэтай вайсковай машыне не звярталі ўвагу. У выніку незалежна ад паходжання жаўнеры ПУСЗ накіроўваліся ў разнастайныя фармаванні, якія былі размеркаваныя на абшары ад Паўночнай Афрыкі да Брытанскіх астравоў.

На падставе апрацоўкі спісу палеглых польскіх вайскоўцаў у адпаведных суадносінах да ацалелых магчыма назваць у адсотках наступныя лічбы вайскоўцаў-беларусаў па асобных польскіх вайсковых частках: Польская армія ў СССР (жнівень 1941 – травень 1942) – 18%, эвакуацыйныя базы ў Іране – 18,8%, вайсковыя адзінкі на Сярэднім Усходзе (канец 1942 – канец 1943) – 12,8%, 1 Польскі корпус ( месца дыслакацыі – Вялікабрытанія; асноўны склад – 1 асобная парашутная брыгада, 1 бранетанкавая дывізія, дапаможныя аддзелы і камандаванне) – 8,4%, 2 Польскі корпус на чале з генералам У.Андэрсам, які змагаўся ў Італіі – 20,6%, Каралеўскія ваенна-паветраныя сілы (1940 – 1945) – 7,4%, Ваенна-марскі флот – 12%. Да гэтай колькасці належыць дадаць некалькі адсоткаў з ліку польскіх вайскоўцаў, якія дзейнічалі ўвесну-ўлетку 1940 г. пад французскай вайсковай камандай, а таксама асобную брыгаду карпацкіх стральцоў. Апошняя брала ўдзел у баях з нямецкімі войскамі ў 1941 г. на паўночнаафрыканскім тэатры ваенных дзеянняў. Варта адзначыць, што на 1 ліпеня 1945 г. ПУСЗ налічвалі 228 тыс. чала-

[15] Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Москва, 1973. Т. VII. С. 271-276.

век. З вышэйпададзеных лічбаў відаць, як адбываўся вайсковы чын беларусаў у якасці жаўнераў ПУСЗ. Дарэчы, цікавая акалічнасць, што напрацягу 1942 – 1945 г. асабовы склад ПУСЗ папаўняўся былымі польскімі грамадзянамі, ў тым ліку і беларусамі, закошт эмігрантаў з краінаў Паўднёвай Амерыкі, якія выехалі з II Рэчы Паспалітай у міжваенны час, а таксама нямецкіх вайскоўцаў польскага і беларускага паходжання, перайшоўшых на бок альянтаў. Аднак гэта была нязначная частка папаўнення.

Тым часам у Маскве пачынае разыгравацца "польская карта". Пры актыўным удзеле прасавецкага Саюза польскіх патрыётаў (СПП) на Разаншчыне ў траўні 1943 г. фармуецца 1-я польская пяхотная дывізія імя Тадэвуша Касцюшкі. Пазней на тэрыторыі СССР быў разгорнуты Польскі корпус, а потым – 1-я Польская армія, якая ўлетку 1944 г. налічвала 110 тыс. чалавек. Значная яе частка фармавалася ў раёне Жытоміра. Як савецкі бок, гэтак і сябры СПП разумелі, што асноўная частка палякаў з СССР эвакуявалася ў 1942 г. у Іран, таму падчас вярбоўкі ўвага акцэнтавалася на жыхарах заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх абшараў. Надзвычай моцна адчуваўся недахоп афіцэраў. Большая частка палонных польскіх афіцэраў была знішчана органамі НКУС, азвыш 4 тыс. выйшла з Андэрсам на Блізкі Усход. Таму афіцэрскі склад фармаваўся праз перавод у польскія фармаванні афіцэраў РСЧА, якія мелі хоць нейкія ўскосныя дачыненні да Польшчы. Перадусім, афіцэры-непалякі накіроўваліся ў тэхнічныя службы ды аддзелы, дзе найбольш бракавала спецыялістаў, бо ваеннае Войска Польскае была слаба матарызаванае. На сакавік 1944 г. у складзе Польскай арміі знаходзілася 1 475 савецкіх афіцэраў, з якіх беларусамі назваліся 141 чал. (9,6%), а палякамі-ўраджэнцамі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны – 782 чал. (53,4%)[16]. Наогул, загады вайны ў шэрагах народнага Войска Польскага змагалася каля 20 тыс. савецкіх афіцэраў, некаторыя з якіх зрабілі вайковую кар'еру ў пасляваеннай Польшчы.

Сярод 1 278 палеглых падчас бітвы 12-13 кастрычніка 1943 г. каля мястэчка Леніна на Магілёўшчыне вайскоўцаў 1-й польскай пяхотнай дывізіі імя Т. Касцюшкі, 539 з'яўляліся ўраджэнцамі Заходняй Беларусі[17]. Паводле ацэнкаў Польскага камітэту нацыянальнага вызвалення (ПКНВ) пасля заняцця ўлетку 1944 г. часцямі савецкіх войскаў тэрыторыі з гарадамі Беласток, Люблін, Аўгустоў і інш., на дадзеным абшары мелася 136 тыс. мужчынаў прызыўнога ўзросту. Аднак суцэльная мабілізацыя ва ўзброеныя сілы на тэрыторыі Польшчы ажно да пачатку 1945 г. суправаджалася масавым дэзерцірствам. Часткова да гэтага спрычынілася польскае нацыянальнае падполле, якое падпарадкоўвалася эміграцкаму ўраду ў Лондане. Польскі бок разлічваў на колькасць да 50 тыс. чалавек, з якіх звыш 25 тыс. былі накіраваныя ў польскія войскі (у асноўным у склад 2-й Польскай арміі на-

[16] Grzalek Cz., Stańczyk H., Zwieliński S. Bez możliwości wyboru. Wojsko Polskie na froncie wschodnim. 1943-1945. Warszawa, 1993. S. 115.

[17] Lenino. Październik 1943. Poległy, zmarły z ran, zaginieni. Warszawa, 1996.

роднага Войска Польскага) яшчэ ў верасні 1944 г. У прыватнасці нацыянальнай стракатасцю адрозніваліся 5 і 6 пяхотныя дывізіі[18].

У першыя пасляваенныя гады, як у ПУСЗ, гэтак і ў 1 і 2 арміях народнага Войска Польскага адбываўся працэс дэмабілізацыі асабовага складу. У першым выпадку ўсе польскія вайсковыя адзінкі былі злучаныя ў Польскі корпус падрыхтоўкі і размяшчэння (ПКПР) на тэрыторыі Вялікабрытаніі. З моманту сканчэння баявых дзеянняў і да канца 40-х г. гэтая адзінка паступова расфармоўвалася. Паводле брытанскага заканадаўства польскія вайскоўцы мелі магчымасць застацца на Брытанскіх выспах і атрымаць грамадзянства. Варта адзначыць, што большасць (асабліва – афіцэрскі склад) гэтымі ўмовамі і скарысталася, асцерагаючыся вяртання ў краіну, якая іх ужо аднойчы пасадзіла за калючы дрот. Аднак вядома, што звыш 100 тыс. вайскоўцаў усё ж вярнуліся на радзіму ў ПНР і СССР, у тым ліку звыш тысячы – ў БССР і Віленскі край ЛітССР[19].

На жаль, адсутнасць адпаведных архіўных крыніцаў пакуль не дазваляе назваць дакладныя лічбы. Іншая частка беларусаў пасля дэмабілізацыі асела на пастаяннае месца жыхарства ў Англіі альбо іншых краінах заходняй Еўропы і Амерыкі. Найбольш нацыянальна свядомыя прадстаўнікі беларусаў у студзені 1947 г. сталі арганізатарамі Згуртавання беларусаў Вялікай Брытаніі. Сярод актывістаў варта ўзгадаць Пятро Сыча, Вінцэнта Жук-Грышкевіча, Юрку Весялкоўскага, Кастуся Акулу, Віктара Сянкевіча і шмат іншых выбітных грамадскіх, палітычных і рэлігійных дзеячоў эміграцыі.

Пасля расфармавання 1 і 2 армій народнага Войска Польскага на іх аснове было распачатае стварэнне ўзброеных сілаў ПНР. Натуральна, што значная частка асабовага складу 300-тысячнага народнага Войска Польскага была звольненая і распушчаная па хатах. Гэта з'ява, перадусім, датычылася адкліканых некалі з савецкіх войскаў афіцэраў-непалякаў, а таксама мабілізаваных шэрагоўцаў з тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Як сцвярджаюць польскія даследчыкі, да верасня 1946 г. з войскаў ПНР было адклікана каля 14 тыс. з 16,4 тыс. яшчэ застаўшыхся савецкіх афіцэраў[20]. Рэшта, ўбачыўшы магчымасці кар'еры ў Войску Польскім, вырашыла застацца ў ПНР. Сярод найбольш вядомых землякоў можна назваць генерала Пятра Ярашэвіча з-пад Нясвіжа, які ў пасляваеннай Польшчы быў віцэ-міністрам нацыянальнай абароны, міністрам горнай прамысловасці, дэпутатам Сойму і г.д. Акрамя таго грамадзянамі ПНР сталі тысячы беларусаў – ўраджэнцаў Беласточчыны, якія ўвосень 1944 г. былі закліканы ў 1 і 2 арміі народнага Войска Польскага менавіта з гэтых мясцінаў. Нагадаем, што буйныя мабілізацыйныя кропкі

[18] Organizacja i działania ludowego Wojska Polskiego w latach 1943-1945. Warszawa, 1958. S. 59; Jurgielewicz W. Rozbudowa ludowego Wojska Polskiego w drugiej połowie 1944 roku // Wojskowy Przegląd Historyczny. 1964. N 3. S. 7-19.

[19] НА РБ. Ф. 787, воп. 1, спр. 39, л. 89-90.

[20] Шота В. Переход войска на мирное положение // История военного дела в Польше. Варшава, 1970. С. 481.

размяшчаліся ў Беластоку і Аўгустове[21]. Асноўная ж частка беларусаў вярнулася на радзіму, дзе яны атрымалі статус удзельнікаў і ветэранаў вайны поплеч з іншымі вайскоўцамі Чырвонай Арміі. 22 чэрвеня 1944 г. выйшаў Указ Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР "Аб праве пераходу ў польскае грамадзянства вайскоўцам Польскай арміі, асобам, якія дапамагаюць ім, іх сем'ям", які дазваляў такі пераход беларусам і ўкраінцам па паходжанні[22]. Менавіта гэта катэгорыя жаўнераў аддалі перавагу грамадзянству ПНР.

Гэткім чынам, робячы падсумаванне вышэйсказанаму яшчэ раз варта пералічыць этапы і прыступкі перыядызацыі ўдзелу беларусаў у польскіх рэгулярных вайсковых фармаваннях з кароткай характарыстыкай: 1) беларусы ў Войску Польскім – нацыянальная меншасць ва ўзброеных сілах іншаземнае краіны (сярэдзіна 1921 – верасень 1939); 2) беларусы ў якасці польскіх ваеннапалонных – адныя з першых ахвяраў Другой сусветнай вайны (верасень 1939 – жнівень 1941); 3) беларусы ў часе фармавання Польскага войска на тэрыторыі СССР (нягледзячы на адсутнасць з польскага і савецкага бакоў пастаноўкі ўласнабеларускага пытання, падчас дадзеных мабілізацыйных мерапрыемстваў адбывалася даволі масавае папаўненне польскіх вайсковых адзінак за кошт беларусаў); 4) баявы шлях беларусаў у складзе польскіх узброеных сілаў (1942 – 1945). З аднаго боку, удзел беларусаў у фармаванні ПУСЗ і баявых дзеяннях на заходніх франтах Другой сусветнай вайны, з іншага, удзел беларусаў у фармаванні і баявым шляху польскіх узброеных сілаў на баку савецкіх войскаў. 5) час перафармавання і расфармавання польскіх частак і дэмабілізацыі іх асабовага складу (1945 – 1947) – часткова беларусы вяртаюцца на радзіму, іншыя застаюцца на чужыне, што тлумачыцца тымчасовым палітычным становішчам.

Такім чынам, у перыяд з 1921 па 1947 г. сярод польскіх вайскоўцаў знаходзілася значная колькасць нашых землякоў, нягледзячы на тое, што польскія ўлады далёка не заўсёды ўлічвалі інтарэсы вайскоўцаў-непалякаў і нават імкнуліся прыхаваць іх бачную прысутнасць у складзе сваіх узброеных сілаў. Прычыны гэткай насычанасці беларусаў у польскім войску наступныя: шчыльныя беларуска-польскія гістарычныя ўзаемадачыненні на пачатку 20 ст., падзел Беларусі паводле Рыжскай дамовы паміж польскім і савецкім бакамі, адсутнасць самастойнага беларускага фактару ў польска-савецкіх узаемадачыненнях падчас Другой сусветнай вайны.

[21] Organizacja i działania bojowe ludowego Wojska Polskiego w latach 1943-1945. Warszawa,1958. S.128-129.

[22] Материалы по истории советско-польских взаимоотношений. Москва, 1974. Т.VIII. С.117.